BELARUS BEEHIVE 2.0
БАЗАВАЕ ДАСЛЕДВАННЕ

Фінальная справаздача

Уводзіны

Даследаванне праведзена ў межах праграмы "Belarus Beehive 2.0: Supporting civil society as a key driver of democratic transformation of Belarus". Праграма падтрымлівае грамадзянскую супольнасць Беларусі ва ўмовах рэпрэсій і рыхтуе яе да дэмакратычных рэформаў. Яна арыентавана на рэарганізацыю і ўзмацненне грамадзянскай супольнасці Беларусі для пашырэння яе магчымасцей уплываць на дэмакратычныя змены ў Беларусі. Belarus Beehive за кошт набору інструментаў праграмы (кансалтынг па арганізацыйным развіцці, прадастаўленне адукацыі, ментарынг і коўчынг, фінансавая падтрымка рэалізацыі праектаў, інстытуцыйная фінансавая падтрымка, падтрымка кааліцый і г.д.) імкнецца змяніць бягучы стан грамадзянскай супольнасці Беларусі, у прыватнасці палепшыць яе чалавечы і арганізацыйны патэнцыял, пашырыць яе доступ да фінансавых сродкаў, павялічыць яе магчымасці адвакатаваць пытанні змен у Беларусі на міжнародным, рэгіянальным і нацыянальным узроўнях. Адэкватная ацэнка стану грамадзянскай супольнасці і эфекту падтрымкі яе з боку Belarus Beehive патрабуе сістэматычнага даследавання шляхам апытання шырокага кола арганізацый розных сектароў грамадзянскай супольнасці (далей – ГС).

Мэты і задачы даследавання.

Даць апісанне і ацэнку стану грамадзянскай супольнасці Беларусі па наступных крытэрыях:

- Апісанне знешніх умоў:
- Стан асяроддзя для дзейнасці ГС (палітычныя і прававыя ўмовы) у Беларусі і месцах найбольшай канцэнтрацыі беларускай ГС за мяжой;
- Ацэнка аб'ёмаў і даступнасці фінансавання з міжнародных і прыватных крыніц.

Апісанне аб'ектыўнай сітуацыі ГС і яе дзейнасці:

- Ацэнка дзейнасці арганізацый у Беларусі і за мяжой. Якія тыпы дзейнасці рэалізуюць, як адказваюць на пагрозы і выклікі (рэпрэсіі з боку рэжыма, кадравыя праблемы, цяжкасці з легалізацыяй дзейнасці і г.д.);
- Ацэнка дамінавання тыповых стратэгій;
- Ацэнка кааперацыі і ўзаемадзеяння арганізацый ГС у Беларусі і за мяжой;
- Ацэнка арганізацыйнай, інстытуцыйнай і фінансавай устойлівасці арганізацый, стану чалавечых рэсурсаў.

Самаацэнка грамадзянскай супольнасці з боку арганізацый (па крытэрыях у пп. 1 і 2).

Даць ацэнку зменам стану ГС у перыяд правядзення даследавання.

Інстытут палітычных даследаванняў ПАЛІТЫЧНАЯ СФЕРА
EASTERN PARTNERSHIP CIVIL SOCIETY FORUM
Funded by the European Union
GREEN NETWORK
EUROBELARUS
RADA

Прадаставіць замоўнікам і стэйкхолдарам рэкамендацыі па змяненні дзеянняў, інструментаў, падыходаў у дачыненні да грамадзянскай супольнасці, якія будуць спрыяць больш эфектыўнай падтрымцы ГС.

Аб'ект даследавання і метадалогія.

Аб'ект даследавання – грамадзянская супольнасць Беларусі і знешняе асяроддзе яе існавання (палітычныя, прававыя, фінансавыя ўмовы). ГС ахоплівае любыя ініцыятывы і арганізацыі незалежна ад наяўнасці рэгістрацыі і ўзроўню інстытуцыяналізацыі. Даследаванне таксама ахоплівае грамадзянскія арганізацыі і ініцыятывы беларусаў за мяжой, калі іх дзейнасць непасрэдна звязана з Беларуссю або беларусамі за мяжой. Былі прадстаўлены арганізацыі розных сектароў: адукацыйныя, культурніцкія, сацыяльнай падтрымкі і абароны, экспертнай супольнасці і інш.

Даследаванне праведзена пры дапамозе анлайн-апытання прадстаўнікоў арганізацый ГС. Анкета скаладалася з некалькіх блокаў: "агульная інфармацыя", "знешнія ўмовы дзейнасці ГС", "супрацоўніцтва і кааліцыі", "самаацэнка", "прагнозы".

Даследаванне было праведзена ў два этапы.

Першы этап (Э1).

Збор адказаў – студзень-красавік 2025 г.

Колькасць удзельнікаў – 63.

Анкета складалася з двух варыянтаў – беларускамоўнага (44 адказы) і рускамоўнага (19 адказаў).

Другі этап (Э2).

Збор адказаў – снежань 2025 - красавік 2026 г.

Колькасць удзельнікаў – 30.

Анкета складалася з двух варыянтаў – беларускамоўнага (19 адказаў) і рускамоўнага (11 адказаў).

Цяжкасці і абмежаванні даследавання абумоўленыя масштабным перасследам з боку беларускага рэжыма як асобных індывідаў, так і ГС у цэлым. Ва ўмовах апасенняў за бяспеку, у т.л. кібербяспеку, рэкрутаваць удзельнікаў даводзілася праз асабістыя кантакты, што павялічвала перыяд збору адказаў. Гэта ж паўплывала на нізкую колькасць удзельнікаў на Э2 у параўнанні з Э1[1].

У гэтай справаздачы за аснову ўзятыя вынікі Э2. Іншым колерам вылучаны дадзеныя Э1 і параўнанне вынікаў Э1 і Э2. Там, дзе паказчыкі не адрозніваюцца, альбо адрозніваюцца зусім нязначна, параўнанне не праводзілася.


[1] Таксама трэба ўлічваць, што паміж правядзеннем Э1 і Э2 (вясна 2025 г. – вясна 2026 г.) пераслед ГС у Беларусі і за мяжой узмацняўся, а колькасць арганізацый працягвала памяншацца. Калі па стане на травень 2025 г. з постэлектаральнага крызісу 2020 г. была ліквідавана альбо знаходзілася ў стадыі ліквідацыі 1936 арганізацый, то на травень 2026 г. такіх было ўжо 2033 (згодна са звесткамі Lawtrend https://www.lawtrend.org/monitoring-issledovania/ezhemesyachnye-monitoringi).

ВЫНІКІ АПЫТАННЯ

АГУЛЬНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ

Індывідуальная характарыстыка апытаных.

Сярод апытаных найбольшую ўзроставую групу складаюць людзі 36-40 год (23.3%), на другім месцы дыяпазон 46-50 (20%), на трэцім – 41-45 (16%), на чацвертым – 31-35 і 51-55 (па 13%). Такім чынам, дамінуе дыяпазон сярэдняга веку, г.зн. 36-50 год (60%). 63% маюць вопыт работы не меней за 10 год як у ГС у цэлым, так і ў сваім сектары ГС. Такі ж адсотак сярод апытаных складаюць кіраўнікі арганізацый, яшчэ 30% займаюць пазіцыі кіраўніка праекта і эквівалентныя[2].









Характарыстыка арганізацый.

Паводле сектароў ГС размеркаванне наступнае (у дужках – адпаведны адсотак на Э1):

Сфера культуры – 23% (17%)

[2] Некаторыя рэспандэнты падалі большую лічбу ў адказе на пытанне 3, чым у адказе на пытанне 4. Магчыма, гэта стала прычынай няправільнага разумення сутнасці пытання 3, дзе «сектар» мог быць зразуметы як сфера дзейнасці наогул (напрыклад, адукацыя), а не сектар грамадзянскай супольнасці.

Інстытут палітычных даследаванняў ПАЛІТЫЧНАЯ СФЕРА
EASTERN PARTNERSHIP CIVIL SOCIETY FORUM
Funded by the European Union
GREEN NETWORK
EUROBELARUS
RADA

Адукацыя – 20% (17%)

Развіццё грамадзянскай супольнасці – 13% (13%)


Развіццё медыя – 10% (6%)

Экспертная і даследчая дзейнасць – 10% (9%)

Сац. абарона і падтрымка ўразлівых груп – 7% (13%)


(астатнія склалі па 3%, што адпавядае аднаму рэспандэнту).

У параўнанні з Э1, найбольш выросла доля сектароў сфера культуры, адукацыя, развіццё медыя. Найбольшае зніжэнне паказалі абарона навакольнага асяроддзя (з 11% да 3%) і сацыяльная абарона і падтрымка ўразлівых груп (з 13% да 7%). Катэгорыя лакальныя ініцыятывы і ўрбанізм, прадстаўленая адным рэспандэнтам на Э1, адсутнічае наогул. Катэгорыя прафсаюзы адсутнічае на абодвух этапах.



У Беларусі дзейнічае 10% арганізацый (Э1 22%). Большасць дзейнічае ў Польшчы (43%) і Літве (40%; Э1 30%). Асобныя арганізацыі актыўныя больш чым у адной краіне. Пры гэтым мэтавая аўдыторыя 70% арганізацый знаходзіцца ў Беларусі. На сувязь з Беларуссю паказвае частата яе згадкі пры адказе на пытанне “У якіх яшчэ краінах дзейнічае ваша арганізацыя?” – 55%. Іншымі частымі адказамі былі Польшча, Літва, Нямеччына і Грузія.

77% маюць афіцыйны статус у краіне, дзе адбываецца асноўная дзейнасць. Сярод тых, у каго гэта Беларусь (n=3), афіцыйны статус маюць 67%.




77% маюць афіцыйны статус у краіне, дзе адбываецца асноўная дзейнасць. Сярод тых, у каго гэта Беларусь (n=3), афіцыйны статус маюць 67%.

Інстытут палітычных даследаванняў ПАЛІТЫЧНАЯ СФЕРА
EASTERN PARTNERSHIP CIVIL SOCIETY FORUM
Funded by the European Union
GREEN NETWORK
EUROBELARUS
RADA

ЗНЕШНІЯ ЎМОВЫ ДЗЕЙНАСЦІ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ

Палітыка-прававыя ўмовы дзейнасці ГС у Беларусі 66% (Э1 52%) ацэньваюць як крайне неспрыяльныя. Астатнія адказы, акрамя аднаго, размеркаваліся ў дыяпазоне 2-3 па 10-бальнай шкале (1 - крайне неспрыяльныя, 10 – вельмі спрыяльныя)[3]. Па-за Беларуссю, наадварот, большасць рэспандэнтаў знаходзіць такія ўмовы даволі спрыяльнымі: 33% (Э1 53%) ацанілі іх у дыяпазоне 8-10, 40% - на 7.




Значна павялічылася доля тых, хто ацэньвае палітыка-прававыя ўмовы ў Беларусі як крайне неспрыяльныя. Вельмі значна знізілася доля тых, хто ацэньвае такія ўмовы на 8-10 па-за Беларуссю.

Становішча з **фінансаваннем** выглядае даволі песімістычна (пытанні 12-14). У ацэнцы даступнасці фінансавання для ўсёй ГС з сямі розных крыніц па шкале ад 1 (вельмі складана атрымаць) да 10 (вельмі проста атрымаць) максімальнае сярэдняе значэнне склала 4.7 – так ацанілі доступ да сродкаў Еўрапейскай камісіі[4] . Найбольш скаладаным бачыцца доступ да сродкаў дапамогі ўрада ЗША – 2.2.


Прыблізна так жа выглядае ацэнка доступу да фінансавання для закрыцця пэўных патрэбаў арганізацый. Складаней за ўсё знайсці сродкі на інстытуцыйнае фінансаванне, падтрымку штата супрацоўнікаў, офіса і г.д. (сярэдняе значэнне 2.3), прасцей за ўсё – на падтрымку новых праектаў (5.0, Э1 4.2) і на работу з мэтавымі групамі (5.3, Э1 4.5). Сярэдняе значэнне паказала нязначны рост па ўсіх патрэбах арганізацый, акрамя інстытуцыйнага фінансавання.


[3] Адзін адказ “8” выглядае выпадковасцю.
[4] Без уліку адказаў “не ведаю”.

12. На вашую думку, наколькі проста/складана беларускім арганізацыям ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ Ў ЦЭЛЫМ атрымліваць фінансаванне з наступных крыніц (1 - вельмі складана, 10 - вельмі проста). Графік паказвае сярэдняе значэнне



13. На вашую думку, наколькі проста/складана беларускім арганізацыям ВАШАГА СЕКТАРА ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ атрымліваць фінансаванне з наступных крыніц (1 - вельмі складана, 10 - вельмі проста):







Цягам апошняга года (ў параўнанні з папярэднім) 43% (Э1 52%) сталі радзей атрымліваць інфармацыю аб магчымасцях фінансавання, 16.7% (Э1 11%) - часцей. Астатнія 40% не ўбачылі зменаў. Адносная большасць рэспандэнтаў – 37% (Э1 28%) - атрымала “9 і больш” паведамленняў пра магчымасці грантавай падтрымкі. 9 і больш заявак падалі 33% (Э1 22%). 1-2 заяўкі падало ўсяго 7% (Э1 11%). Няма такіх, хто б не падаў ніводнай заяўкі.

У цэлым карціна з грантавымі магчымасцямі трошкі палепшылася ў параўнанні з Э1. Узрасла колькасць тых, хто атрымаў больш паведамленняў пра магчымасці фінансавання за апошні год. Таксама ўзрасла сярэдняя колькасць пададзеных заявак.








Размеркаванне заявак па відах дзейнасці і крыніцах фінансавання атрымалася наступным (на графіку). Сярод відаў дзейнасці дамінуе праектная дзейнасць, сярод жа крыніц фінансавання заўважна пераважае Еўрапейская камісія і праграмы нацыянальных урадаў.

Інстытут палітычных даследаванняў ПАЛІТЫЧНАЯ СФЕРА
EASTERN PARTNERSHIP CIVIL SOCIETY FORUM
Funded by the European Union
GREEN NETWORK
EUROBELARUS
RADA



СТРАТЭГІЯ

У адпаведнасці з мясцовымі прававымі нормамі дзейнічае 73% (Э1 68%) арганізацый. Сярод прычын, якія не дазваляюць цалкам выконваць мясцовае заканадаўства, называюць складанасці работы з людзмі ў Беларусі і з беларускімі грамадзянамі наогул, спецыфіку заканадаўства Літвы адносна НДС і недахоп прававых ведаў. У адказе на пытанне “Як бы вы апісалі ўзаемаадносіны арганізацый грамадзянскай супольнасці і ўлады ў Беларусі?” ніхто не выбраў варыянта “улады супрацоўнічаюць і садзейнічаюць рабоце”, і толькі адзін рэспандэнт адказаў, што “улады не перашкаджаюць рабоце”. 40% (Э1 25%) лічаць, што ў Беларусі немагчымая ніякая дзейнасць з-за перашкодаў з боку рэжыма, яшчэ 40% (Э1 59%) бачаць немагчымай легальную дзейнасць.

У цэлым заўважны адток кадраў па сектарах ГС. 43% (Э1 32%) назіраюць нязначнае памяншэнне, яшчэ 20% - значнае. Нязначнае павелічэнне заўважылі 17% (Э1 22%).

Адказы на пытанне “Якія стратэгіі дамінуюць у вашым сектары грамадзянскай супольнасці” (множны выбар) размеркаваліся наступным чынам:

Арыентацыя на дыяспару і на ўладкаванне жыцця ў дыяспары – 60% (Э1 41%)

Чаканне зменаў у Беларусі – 53% (Э1 28%)

Інстытут палітычных даследаванняў ПАЛІТЫЧНАЯ СФЕРА
EASTERN PARTNERSHIP CIVIL SOCIETY FORUM
Funded by the European Union
GREEN NETWORK
EUROBELARUS
RADA


Работа на змены ў Беларусі – 50% (Э1 71%)

Адаптацыя да існуючых умоў у Беларусі – 30% (Э1 49%)

Значна ўзрасла доля тых, хто лічыць немагчымай ніякую дзейнасць у Беларусі – з 25% да 40%. Відаць, гэта адбылося за кошт памяншэння долі тых, хто лічыць немагчымай легальную дзейнасць – з 59% да 40%. Пагоршылася і без таго няпростая сітуацыя з кадрамі. Павялічылася доля тых, хто назіраў нязначнае памяншэнне занятых у сектары цягам апошняга года (з 32% да 43%), з адначасовым памяншэннем долі тых, хто назіраў нязначны рост (з 22% да 17%). Кардынальна памянялася бачанне дамінуючай стратэгіі ў сектары. Калі Э1 паказаў перавагу работы на змены ў Беларусі, то Э2 дэманструе дамінаванне арыентацыі на дыяспару і чакання зменаў у краіне, хоць адсотак выбара работы на змены ў Беларусі застаецца высокім – 50%.

СУПРАЦОЎНІЦТВА І КААЛІЦЫІ






На пытанне “Ці існуе кааперацыя паміж арганізацыямі вашага сектара грамадзянскай супольнасці і актарамі ў Беларусі?” 57% адказала станоўча, 10% (Э1 14%) - адмоўна. Па ўсёй выбарцы на 5 паспяховасць кааперацыі не ацэньвае ніхто. Асноўная маса адказаў размеркавалася пароўну паміж адзнакамі 2, 3 і 4[5].


На пытанне “Ці існуе кааперацыя паміж арганізацыямі вашага сектара грамадзянскай супольнасці і актарамі па-за Беларуссю” 90% (Э1 79%) адказала станоўча і толькі 10% (Э1 6%) адмоўна. Ацэнка паспяховасці такой кааперацыі выглядае больш пазітыўнай, чым з арганізацыямі ў Беларусі. Па ўсёй выбарцы на 4 і 5 паспяховасць кааперацыі ацэньваюць 43% (Э1 53.8%), на 3 – 40% (Э1 36.5%).


[5] На ўдакладненне “Калі “так”... адказала больш людзей, чым уласна “так” на адпаведнае пытанне.






73% (Э1 68%) сказалі, што іх арганізацыя рэалізуе сумесныя праекты з арганізацыямі ТАГО Ж СЕКТАРА ГС (на працягу апошняга года). Адносна сумесных праектаў з арганізацыямі ІНШЫХ СЕКТАРОЎ ГС гэты паказчык склаў 63%.






73% (Э1 60%) арганізацый уваходзяць у кааліцыі/парасонавыя арганізацыі/сеткі. Гэта ў цэлым пазітыўна адбіваецца на стане арганізацый па прапанаваных шасці аспектах. Найменш кааліцыі садзейнічаюць павышэнню эфектыўнасці дзейнасці арганізацый, найбольш – умацаванню сувязяў з замежнымі арганізацыямі (Э1 - умацаванню сувязяў з беларускімі арганізацыямі). Устойлівасць такіх кааліцый у сярэднім даволі высокая: па шкале ад 1 (абсалютна сітуатыўныя) да 10 (вельмі ўстойлівыя) значна пераважаюць адказы ў дыяпазоне 6-9 (Э1 - амаль пароўну размяркоўваліся па медыяне (1-5 і 6-10)).







У цэлым Э2 паказвае больш кааперацыі паміж арганізацыямі, чым Э1. Зніжэнне адбылося толькі ў ацэнцы паспяховасці кааперацыі паміж арганізацыямі і актарамі па-за Беларуссю. Больш рэспандэнтаў лічаць, што такой кааперацыі няма (Э2 10%, Э1 6%), і менш бачаць яе паспяховай (зніжэнне пазітыўнай ацэнкі кааперацыі з 54% да 43%). Звяртае на сябе ўвагу перанос вагі пазітыўнага эфекта ад удзелу ў кааліцыях/парасонавых арганізацях/сетках на ўмацаванне сувязяў з замежнымі арганізацыямі замест арганізацый у Беларусі.


САМААЦЭНКА

Фінансава вельмі ўстойлівых (9-10) арганізацый няма. На 8 такую ўстойлівасць ацаніў толькі адзін рэспандэнт. Доля дыяпазону вышэй за 5 – 33% (Э1 21%), доля дыяпазона 1-3 – 43%.

У бюджэтах арганізацый міжнароднае, нацыянальнае і прыватнае донарскае фінансаванне заўважна пераважае усе астатнія варыянты. 13% (Э1 30%) арганізацый цалкам фінансуюцца за кошт гэтай крыніцы, для яшчэ 53% яна складае 70-90% (Э1 44%) агульнага фінансавання. Сярод “іншага” былі называныя прыбыткі ад аказання паслуг (n=3) і “прыватныя ахвяраванні” (n=1)[6].

[6] На рэлевантнасць вынікаў можа аказаць уплыў тое, што не ўсе рэспандэнты адказалі на адпаведнае пытанне належным чынам. Нягледзячы на наяўнасць опцыі “іншае”, у сямі выпадках агулам атрымалася 90% замест 100%, яшчэ ў двух – 80%, па адным - 60%, 20%, 10% і 0%. Адзін рэспандэнт пакінуў пытанне без адказу, яшчэ адзін не раскрыў змест варыянта “іншае”.







77% (Э1 71.5%) лічаць, што размяркоўваць донарскія сродкі ў іх сектары ГС павінны і замежныя, і айчынныя арганізацыі.

У дзейнасці большасці арганізацый цягам апошняга года хутчэй пераважае тэндэнцыя адаптацыі да бягучай сітуацыі, а не падрыхтоўкі перамен у Беларусі (па шкале ад 1 – “адаптацыя” да 10 – “перамены”). 57% (Э1 68%) знаходзяцца ў дыяпазоне 1-5. Аднак перавага меншая, чым на Э1.



У ацэнцы ўстойлівасці уласных арганізацый (па шкале ад 1 – “вельмі няўстойлівыя” да 10 – “вельмі ўстойлівыя”) пераважаюць сярэднія значэнні. Аднак, доля тых, хто трапляе ў дыяпазон 1-5, вельмі высокая – 47% (Э1 55%).




У 20% арганізацый недахопу ў спецыялістах няма. Найбольш запатрабаваныя фінансавыя спецыялісты – 37% і спецыялісты па знешніх камунікацыях – 33%. Найменшы недахоп спецыялістаў па бяспецы – 7%. IT-спецыялісты, якія былі самымі запатрабаванымі на Э1 (40%), аказаліся на шостай пазіцыі разам з кіраўнікамі праектаў – 20%.

Інстытут палітычных даследаванняў ПАЛІТЫЧНАЯ СФЕРА
EASTERN PARTNERSHIP CIVIL SOCIETY FORUM
Funded by the European Union
GREEN NETWORK
EUROBELARUS
RADA

Сярод **асноўных праблем** і перашкод (пытанне 36) заўважна выдзяляюцца даступнасць міжнароднага фінансавання – 63% (Э1 71%), фінансавыя цяжкасці – 70% (Э1 87%) і ціск з боку беларускіх уладаў – 50% (Э1 55%). Найменш праблемным бачыцца кадравае пытанне і справаздачнасць донарскім арганізацыям.

Тры найбольш праблемныя сферы захавалі свае пазіцыі ў параўнанні з Э1. Але пры гэтым адсотак выбара абодвух варыянтаў, звязаных з фінансаваннем, істотна знізіўся. Такое зніжэнне можа быць часткова патлумачана нізкай колькасцю рэспандэнтаў, чые арганізацыі знаходзяцца ў Беларусі. На Э1 такіх было n=14, на Э2 – n=3. 13 з 14 такіх рэспандэнтаў на Э1 назвалі фінансы ў адказ на гэта пытанне. З іншага боку, паляпшэнне можа быць звязана са зменамі фактычнага становішча з фінансаваннем.



Сярод асноўных **патрэбаў** (тып пытання – свабодны тэкст) 57% (Э1 84%) назвалі тыя, што звязаныя з фінансаваннем, 43% (Э1 24%) - з арганізацыяй працэсаў і стратэгічным планаваннем, 20% - з кадрамі, 13% (Э1 8%) - з бяспекай/ціскам з боку ўладаў Беларусі і цяжкасцямі работы ў Беларусі.


Тут ізноў назіраецца змяншэнне адсотку тых, хто назваў фінансы асноўнай праблемай. Тым не менш, гэта застаецца найбольш папулярным адказам. Рэзка вырасла доля тых, хто заклапочаны доўгатэрміновым развіццём арганізацыі.


ПРАГНОЗЫ

Развіццё ўсяго сектара на бліжэйшыя паўгады пераважная большасць бачыць песімістычна. Варыянт адказаў стане нашмат лепей не выбраў ніхто. Толькі каля 7% вераць, што стане лепей ці стане трошкі лепей. Усе астатнія адказы размеркаваліся ў дыяпазоне паміж без зменаў і стане нашмат горш. Агулам пагаршэння чакаюць 60% (Э1 81%). Наконт сітуацыі з доступам да фінансавання яшчэ больш песімізму: пагаршэння чакае 77%.

Што тычыцца прагнозу стану ўласнай арганізацыі на наступныя паўгады, то тут куды больш аптымізму, што кантрастуе з прагнозам для сектара ГС у цэлым і для доступу да фінансавання. Доля тых, хто лічыць, што «стане лепей» і «стане трошкі лепей», складае аж 37% (Э1 25%).

Прагнозы выглядаюць у цэлым больш аптымістычнымі, чым на Э1, за выняткам ацэнкі сітуацыі з доступам да фінансавання. Істотна выросла доля тых, хто аптымістычна глядзіць на становішча ўласнай арганізацыі ў будучыні – з 25% да 37%. Зніжэнне адсотка тых, хто чакае пагаршэння стану сектара ГС адбылося ў асноўным за кошт рэзкага роста долі рэспандэнтаў, якія не бачаць зменаў у найбліжэйшай будучыні – з 10% да 33%.







РЭЗЮМЕ

У выбарцы пераважаюць рэспандэнты са значным вопытам работы ў ГС (10 год і больш). Большасць апытаных (65%) займае пасады кіраўнікоў арганізацый. Паводле сектароў пераважаюць арганізацыі сферы культуры (23%), адукацыі (20%) і развіцця ГС (13%). Толькі 10% (n=3) арганізацый праводзяць асноўную дзейнасць у Беларусі, што кантрастуе з 22% на Э1. Пры гэтым 70% усёй выбаркі маюць сваю асноўную мэтавую аўдыторыю ў Беларусі, што паказвае на высокую сувязь з краінай (такі ж паказчык прадэманстраваў Э1).

Такая малая колькасць рэспандэнтаў "з Беларусі" робіць па вялікім рахунку нерэлевантнай дыферэнцыяцыю паміж імі і рэспандэнтамі па-за краінай, хоць Э1 паказаў вялікую розніцу паміж гэтымі катэгорыямі ў адказах на шэраг пытанняў анкеты. Гэтай жа акалічнасцю можна патлумачыць некаторую розніцу ў выніках Э1 і Э2, напрыклад, што тычыцца пытанняў фінансавання.

77% маюць афіцыйны статус у краіне, дзе адбываецца асноўная дзейнасць. У параўнанні з Э1, павялічылася доля тых, хто лічыць палітыка-прававыя ўмовы дзейнасці ГС у Беларусі крайне неспрыяльнымі. У той жа час значна зменшыўся адсотак ацэнкі такіх умоваў па-за Беларуссю як вельмі спрыяльных. Першае можа быць патлумачана узмацненнем ціску і пераследу ГС з боку беларускага рэжыма, а другая – пэўным пагаршэннем становішча беларускай дыяспары ў асноўных краінах яе знаходжання, найперш у Літве.

Пераважная большасць рэспандэнтаў лічыць сітуацыю з фінансаваннем досыць складанай як у сваім сектары, так і ў ГС у цэлым, хоць у параўнанні з Э1 можна назіраць некаторае паляпшэнне. Цяжэй за ўсё знайсці сродкі на інстытуцыйнае фінансаванне, падтрымку штата супрацоўнікаў, офіса і г.д., прасцей за ўсё, але ўсё адно складана, - на праектную дзейнасць і на работу з мэтавымі групамі. Цягам апошняга года 43% сталі радзей атрымліваць паведамленні аб магчымасцях фінансавання, тады як на Э1 адпаведны адсотак склаў 52%. Больш рэспандэнтаў, чым на Э1, атрымала 9 і больш паведамленняў пра грантавыя магчымасці. Тое ж тычыцца і долі тых, што падалі 9 і больш грантавых заявак. Сярод крыніц фінансавання на Э1 і Э2 пераважаюць праграмы Еўрапейскай камісіі і праграмы нацыянальных урадаў.

Пагоршылася сітуацыя з кадрамі, якая была і без таго досыць няпростай. Павялічылася доля тых, хто бачыць памяншэнне колькасці людзей у сваім сектары ГС, і знізіўся адсотак рэспандэнтаў, якія бачаць павелічэнне. Назіраецца недахоп кваліфікаваных кадраў у розных галінах. IT-спецыялісты, якія былі самымі запатрабаванымі на Э1 (40%), аказаліся на шостай пазіцыі разам з кіраўнікамі праектаў – 20%. На першае месца выйшлі фінансавыя спецыялісты (37%) і спецыялісты па знешніх камунікацыях (33%). Можна зрабіць выснову, што некаторыя цяжкасці – недахоп кадраў, праблемы з арганізацыяй працэсаў, стратэгічным планаваннем і інстытуцыйнай падтрымкай і г.д. – можна было б пераадолець пры дастатковым фінансаванні. Асобнай складанасцю застаецца палітычны клімат у Беларусі, які ўплывае на работу арганізацый.

Інстытут палітычных даследаванняў ПАЛІТЫЧНАЯ СФЕРА
EASTERN PARTNERSHIP CIVIL SOCIETY FORUM
Funded by the European Union
GREEN NETWORK
EUROBELARUS
RADA

Заўважныя перамены адбыліся ў тым, як рэспандэнты бачаць дамінуючыя стратэгіі ў сваім сектары ГС. Калі на Э1 70% лічылі, што пераважае работа на змены ў Беларусі, то Э2 дае такому варыянту 50%, тады як арыентацыя на дыяспару выйшла на першае месца з 60% (пры гэтым важна, што арыентацыя на мэтавую аўдыторыю ў Беларусі не зменшылася, гл. вышэй).

У цэлым Э2 паказвае больш кааперацыі паміж арганізацыямі, чым Э1. Важна, што кааліцыі і сеткі сталі больш устойлівымі. Зніжэнне адбылося толькі ў ацэнцы паспяховасці кааперацыі паміж арганізацыямі і актарамі па-за Беларуссю. Больш рэспандэнтаў лічаць, што такой кааперацыі няма (Э2 10%, Э1 6%), і менш бачаць яе паспяховай (зніжэнне пазітыўнай ацэнкі кааперацыі з 54% да 43%). Звяртае на сябе ўвагу перанос вагі пазітыўнага эфекта ад удзелу ў кааліцыях/парасонавых арганізацях/сетках на ўмацаванне сувязяў з замежнымі арганізацыямі замест арганізацый у Беларусі.

Ацэнка стану ўласных арганізацый апытаных адпавядае ў цэлым ацэнцы ГС і яе сектароў. Большасць лічыць свае арганізацыі малаўстойлівымі фінансава. Але Э2 паказаў большую долю рэспандэнтаў, якія ацанілі фінансавую ўстойлівасць сваіх арганізацый на 6 і вышэй (33% супраць 21%). У бюджэтах арганізацый міжнароднае, нацыянальнае і прыватнае донарскае фінансаванне заўважна пераважае долі іншых крыніц.

Прагнозы па стане свайго сектара ў кароткатэрміновай перспектыве (на паўгады) песімістычныя, асабліва ў тым, што тычыцца фінансавання – большасць лічыць, што стане горш. Пры гэтым, аднак, адносна ўласных арганізацый градус песімізму значна ніжэйшы. Пры гэтым Э2 паказвае пэўны рост аптымістычных настрояў, акрамя прагноза адносна фінансавання.

Высновы і рэкамендацыі.

Палітычныя і прававыя ўмовы для дзейнасці арганізацый грамадзянскай супольнасці ацэньваюцца як даволі складаныя, і назіраецца пагаршэнне ўспрымання сітуацыі як у Беларусі (рэпрэсіі і пераслед па палітычных матывах), так і за мяжой (пагаршэнне клімату для беларускай дыяспары). Скарачэнне ўдзелу ў апытанні напалову паміж Э1 і Э2, што тлумачыцца праблемамі бяспекі і неабходнасцю вярбоўкі праз асабістыя кантакты, таксама з'яўляецца «мяккім» паказчыкам закрыцця грамадзянскай прасторы.

Сітуацыя з фінансаваннем разглядаецца як аднолькава складаная як для грамадзянскай супольнасці ў цэлым, так і для асобных сектараў. На працягу года (вясна 2025 – вясна 2026) назіраецца некаторае паляпшэнне ў ацэнцы доступу да фінансавання для пакрыцця пэўных патрэб арганізацый, а таксама ў даступнасці грантавых магчымасцей і колькасці пададзеных грантавых заявак. Таксама назіраецца пэўнае павелічэнне сярэдняй ацэнкі ўстойлівасці ўласных арганізацый. Аднак на абодвух этапах апытання ніводная арганізацыя не палічыла сябе па-сапраўднаму ўстойлівай.

Нягледзячы на агульнае паляпшэнне сітуацыі з персаналам за апошні год, пераважная большасць арганізацый адчувае дэфіцыт спецыялістаў. Можна меркаваць, што праблемы з персаналам выкліканыя не столькі аб'ектыўнай сітуацыяй на рынку працы, колькі недахопам фінансавання і пагрозамі, звязанымі з бяспекай. Найбольш запатрабаванымі з'яўляюцца менавіта тыя супрацоўнікі, якіх цяжка ўтрымліваць за кошт праектных грантаў з абмежаваным мэтавым прызначэннем. Такім чынам, сама структура фінансавання праз праекты можа спрыяць кадравай праблеме.

Пры ацэнцы дамінуючых стратэгій грамадзянскай супольнасці чакана павялічылася доля арыентацыі на дыяспару і зніжэнне долі працы па падрыхтоўцы да змен у Беларусі. Гэта адлюстроўвае аб'ектыўную сітуацыю і бягучыя патрэбы у арганізацыі жыцця і працы ў краінах знаходжання, а не змены ў стратэгічным бачанні. Арыентацыя на мэтавую аўдыторыю ў Беларусі засталася нязменнай. Некаторае змяншэнне акцэнту рэспандэнтаў на падрыхтоўцы пераменаў у Беларусі можа быць звязанае і са зменай прыярытэтаў міжнароднага фінансавання, што можа ўскосна ўплываць на стратэгічны фокус арганізацый.

Але калі асяроддзе дзейнасці ў асноўных краінах знаходжання (у прыватнасці, Літве і Польшчы) таксама становіцца менш спрыяльным, арганізацыі могуць сутыкнуцца з падвойным ціскам - больш энергіі патрабуецца для таго, каб заставацца жыццяздольнымі там, дзе яны знаходзяцца, а ў той жа час ад іх чакаецца захаванне праграмнай арыентацыі на Беларусь.

Станоўчы ўплыў з боку Belarus Beehive можна ўбачыць у тэндэнцыях адносна ахопу арганізацый супрацоўніцтвам і кааліцыямі (сеткамі, арганізацыямі-парасонамі), сярод іншага, у павышэнні іх устойлівасці. Аднак перавагі кааліцый адыходзяць ад сувязяў, накіраваных на Беларусь, у бок сувязяў з замежнымі арганізацыямі.

Фінансаванне грамадзянскай супольнасці абмежавана невялікай колькасцю даступных крыніц. Праграмы, якія рэалізуюцца Еўрапейскай камісіяй і нацыянальнымі ўрадамі, пераважаюць як сярод крыніц, да якіх звяртаюцца арганізацыі, так і ў заяўках, якія яны падаюць. Сектар, які так моцна залежыць ад аднаго або двух тыпаў донараў, уразлівы да змен у прыярытэтах або бюджэтных параметрах любога з іх.

Шэраг станоўчых змен, якія назіраюцца паміж этапамі Э1 і Э2, асабліва адносна доступу да фінансавання, актыўнасці заявак, устойлівасці кааліцый і арганізацыйнай стабільнасці, могуць быць звязаны з падтрымкай, якую аказвае праграма «Belarus Beehive». Аднак, каб усталяваць прамую прычынна-выніковую сувязь паміж назіраным уздзеяннем і гэтай падтрымкай, будучыя апытанні павінны падзяляць рэспандэнтаў на тых, хто атрымаў падтрымку, і тых, хто яе не атрымаў.

Асноўнымі патрэбамі і праблемамі грамадзянскай супольнасці па-ранейшаму застаюцца пытанні, звязаныя з: 1. фінансаваннем; 2. інстытуцыйным развіццём, стратэгічным планаваннем і арганізацыяй працэсаў; 3. ціскам з боку беларускіх уладаў і пытаннямі бяспекі.

Зыходзячы з вышэйзгаданага аналізу, можна прапанаваць наступныя **Рэкамендацыі для донараў і буйных пасрэдніцкіх няўрадавых арганізацый:**

Структура фінансавання

- Забяспечваць базавае і інстытуцыйнае фінансаванне, а не толькі праектнае. Гэта найменш даступны тып падтрымкі, які большасць донараў неахвотна прадастаўляюць. Гнуткі шматгадовы інструмент базавай падтрымкі вырашае праблему, якая заняла першае месца сярод праблем, выяўленых у даследаванні, больш непасрэдна, чым толькі кансультацыйная падтрымка.
- Для дыверсіфікацыі крыніц фінансавання каардынаваць паміж донарамі прадастаўленне рэзервовага або пераходнага фінансавання, каб скарачэнне або затрымка фінансавання з адной буйной крыніцы (напрыклад, Еўрапейскай камісіі або USAID) не выклікала адразу хвалі арганізацыйных збояў.
- Калібраваць чаканні адносна развіцця грамадзянскай супольнасці з рэальным станам і стратэгіямі сектара. Ніводная з апытаных арганізацый не ацаніла сваю фінансавую ўстойлівасць на 9–10 балаў. Адпаведна, крытэрыі фінансавання, якія патрабуюць высокага ўзроўню ўстойлівасці, рызыкуюць выключыць тыя самыя арганізацыі, для якіх прызначаны праграмы падтрымкі..

Кадравыя рэсурсы і арганізацыйны патэнцыял

- Фінансаваць утрыманне супрацоўнікаў, а не толькі іх навучанне. Дэфіцыт персаналу найбольш востры ў ролях, звязаных з фінансамі і знешнімі камунікацыямі, – функцыях, якія з'яўляюцца бесперапыннымі і сістэмна важнымі, але іх цяжка падтрымліваць за кошт праектнага фінансавання. Механізмы сумеснага фінансавання, спецыяльна накіраваныя на гэтыя ролі, дазволяць закрыць прабел, выяўлены ў даследаванні, больш эфектыўна, чым агульнае навучанне па арганізацыйным развіцці.
- Забяспечваць фінансаванне падтрымкі бяспекі і кібербяспекі як асобны пастаянны бюджэтны артыкул, а не як неабавязковы дадатак.

Масштаб адстойвання інтарэсаў і падтрымкі кааліцый

- Пашыраць падтрымку адстойвання інтарэсаў у частцы асяроддзя дзейнасці арганізацый грамадзянскай супольнасці ў выгнанні ў краінах знаходжання. Зніжэнне станоўчых ацэнак умоў дзейнасці за межамі Беларусі (асабліва ў Літве) сведчыць аб тым, што пытанні рэгістрацыі, падаткаў і прававога статусу ў асноўных цэнтрах дыяспары становяцца самастойным абмежаваннем і патрабуюць непасрэднага ўзаемадзеяння з урадамі краін, якія прымаюць гэтыя арганізацыі.
- Пры фінансаванні кааліцый або сетак ставіць выразныя чаканні адносна падтрымання сувязяў з арганізацыямі і дзеячамі ўнутры Беларусі. Дадзеныя сведчаць, што, калі гэтым не кіраваць, перавагі ад сяброўства ў кааліцыях зрушваюцца ў бок сувязяў паміж арганізацыямі, якія працуюць па-за Беларуссю.

Маніторынг і зваротная сувязь

- Інвесціраваць ва ўласны патэнцыял сектара грамадзянскай супольнасці для правядзення бяспечных і рэпрэзентатыўных даследаванняў.
- Перыядычна правяраць, ці адпавядаюць патрабаванні да справаздачнасці фактычным адміністрацыйным магчымасцям арганізацый-партнёраў. Арганізацыі ўжо адчуваюць недахоп персаналу ў фінансавай функцыі; чаканні ад справаздачнасці варта перагледжваць, а не пакідаць без зваротнай сувязі і паляпшэнняў.

Інстытут палітычных даследаванняў ПАЛІТЫЧНАЯ СФЕРА
EASTERN PARTNERSHIP CIVIL SOCIETY FORUM
Funded by the European Union
GREEN NETWORK
EUROBELARUS
RADA